Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Даўгінаўская сярэдняя школа
імя У.І.Слабодчыкава ”

# Чалавек і свет

ў 5 класе (6 клас першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю)

## **Тэма:** ПАВЕТРА

Настаўнік-дэфектолаг
Н.А. Цімашчук

Чалавек і свет

Тэма: Паветра

Мэта: 1) замацаваць веды аб уласцівасці паветра,ахове паветра;

2)развіваць зрокавую ўвагу,доўгачасовую памяць,звязную мову;

3)выхоўваць назіральнасць,цікавасць да прадмета.

Абсталяванне: відыёролікі, падручнік, малюнкі, свечка для выканання вопыту.

Ход урока

**I. Арганізацыйны момант**

Добры дзень, Валера.

Зрабі глыбокі удых і выдых (3 разы). Пажадаем адзін аднаму ўдыхнуць здароўя - выдыхнуць хваробы. Удыхнуць дабро-выдыхнуць непрыемнасці.Удыхнуць упэўненасць-выдыхнуць трывожнасць і скаванасць!

Нам лёгка і добра!

**II. Актуалізацыя ведаў.**

<u>Праверка дамашняга задання</u>

-Сёння мы прадаўжаем вывучаць тэму “Паветра” і замацоўваць веды,якія былі атрыманы на папярэднім уроку.Праверым,як ты выканаў дамашняе заданне.Правядзём невялічкую самастойную работу.

<u>**Самастойная работа**</u>

Выбраць правільнае выказванне(падкрэсліць)

-паветра неабходна для дыхання людзям,жывёлам,раслінам;

-паветра мае чорны колер ,скрозь яго мы нічога не бачым;

-паветра можна адчуць,калі памахаць рукой

(правяраем разам з вучнем)

**III.Асноўная частка**

*Пераходзім да асноўнай часткі нашага урока- ахова паветра.

Мы ведаем,якімі ўласцівасцямі валодае паветра.

Без паветра не будзе жыцця.Прадоўжы маё выказванне**: без паветра не будзе жыцця і мы павінны яго…..(берагчы)**

Правядзём невялічкі вопыт, які дазволіць нам убачыць чаго не можа быць без паветра(вопыт са свечкай выконваецца разам з настаўнікам)

<u>Вынік: без паветра немагчыма гарэнне.</u>

Усё часцей і часцей можна бачыць у розных вугалках такія страшныя малюнкі .











***Прагляд відыёроліка па ахове паветра.**
***Вынік прагляду відыёроліка**

*** Гімнастыка для вачэй**

-Прыляцеў матылёк і сеў на кончык указкі.Давай паназіраем за яго палётам(рух вачыма па зялёным крузе)

***Выраб памятак па ахове паветра.**

(вучань размалёўвае трафарэты)

**IV.Вынік**

-Для чаго ўсяму жывому паветра патрэбна?

-Што забруджвае паветра?

-Што неабходна рабіць ,каб дыхаць чыстым паветрам?

**Рэфлексія** (вывешваюцца на дошцы)

-Дзівоснае паветра!Яно прысутнічае ўсюды: у пакоі,на вуліцы.Выберы словы, якімі б ты навучыў сваіх сяброў берагчы паветра.

- ламаць дрэўцы

-садзіць дрэўцы,кветкі

-спальваць бытавое смецце

-праводзіць уборку памяшканняў

Складзі сказ са слоў , якія рассыпаліся**: Ахова паветра-вельмі важная справа**

**Дамашняе заданне ст. 76,адказаць на пытанні**

**Выбраць правільнае выказванне(падкрэсліць)**

-паветра неабходна для дыхання людзям,жывёлам,раслінам;

-паветра мае чорны колер ,скрозь яго мы нічога не бачым;

-паветра можна адчуць,калі памахаць рукой

**ламаць дрэўцы**

**садзіць дрэўцы,кветкі**

**спальваць бытавое смецце**

**праводзіць уборку памяшканняў**

**Ахова паветра-вельмі важная справа**